Шыфр:______________________________ Зацвярджаю

Колькасць балаў:_________________ Намеснік старшыні

аргкамітэта, намеснік Міністра адукацыі

Месца:______________________ ___________________К.С. Фарыно

«22» ______12______2011 года

# III ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт 2

**Заданне 1.** У залежнасці ад рытмічнай і інтанацыйнай арганізацыі выказванне *«Вучыцца – наша мэта!»* можа мець некалькі значэнняў. Раскрыйце іх, прывёўшы неабходны кантэкст. Што выступае асноўным сродкам размежавання значэння ў межах аднаго выказвання?

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

*Вучыцца – наша мэта!*_______________________________________________

*Вучыцца – наша мэта!*_______________________________________________

*Вучыцца – наша мэта!*_______________________________________________

Сродак размежавання значэнняў: ________________________________

**Заданне 2.** Вызначце і запішыце па-беларуску лексічнае значэнне рускага і беларускага слова ў пары.

***Узор:** краска – краска: палявая кветка – рэчыва, якое надае пэўны колер прадметам.*

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

| | |
|---|---|
| 1) справа – справа: | |
| 2) плот – плот: | |
| 3) поўдзень – полдень: | |

**Заданне 3.** Аб'яднайце пары слоў у групы паводле сэнсавых суадносін слоў у парах. Назавіце гэтыя групы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Бясплатны – дармовы, велічэзны – гіганцкі, розум – дурасць, спёка – сцюжа, факт – фактар.

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 4.** Упішыце словазлучэнні ў патрэбныя слупкі табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

(А, а) хілесава (П, п)ята, (Б, б)ожая (М, м)аці, (Г, г)рафства (С, с)усэкс, (Д, д)амоклаў (М, м)еч, (Дз, дз)ень (Б, б)ібліятэк, (Дз, дз)ень (П, п)ерамогі, (З, з)ольчыны (Р, р)эчы, (Л, л)яднік (Л, л)амберта, (Дз, дз)якаваць (Б, б)огу [*усё добра*], (Р, р)од (С, с)апегаў.

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 5.** Патлумачце значэнне фразеалагізма (*1*). Запішыце фразы, у якіх названы фразеалагізм выконвае ролю розных членаў сказа (*2*).

*Максімальная колькасць балаў – 6 (1 + 5).*

***правая рука*** ____________________________________________

| Член сказа | Ілюстрацыя |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 6.** Прыведзены сербскія словы і іх пераклады на беларускую мову ў зменелай паслядоўнасці: *дрвосеча, јасенак, казивач, колотечина, грачати* – апавядальнік, каляіна, дрывасек, ісці, цень.

Знайдзіце і запішыце беларускія адпаведнікі да сербскіх слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

**Заданне 7.** У рэкламе нас папярэджваюць уважліва чытаць дамову. Але наколькі ўважліва мы чытаем мастацкія тэксты?

Патлумачце значэнні выдзеленых слоў з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка».

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

1) *Так утвораны гэты свет: / Грэе сонца, ходзяць хмары, / Носяць снег і дождж і гром, / Ночкай выныкнуць* ***стажары****, / І бяздонныя амшары / Зоркі вышываюць руном...*

2) *Разоў пяць губляў авечкі, / Шкоды ў полі нарабіў, / Здрасаваў шнуроў тры грэчкі, /* ***Вератнік*** *аўса прыбіў!*

3) *...Дзед –* ***шалыга****, шалахта.*

| Слова | Значэнне слова |
|---|---|
| 1) стажары | |
| 2) вератнік | |
| 3) шалыга | |

| 4) шалахта | |
|---|---|

**Заданне 8** Адзначце, які з варыянтаў пераліку тэкстуальных фактаў, гісторыка- і тэарэтыка-літаратурных паняццяў і характарыстык адпавядае творчасці Максіма Багдановіча.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

А) Класічныя формы верша, сентыменталізм, адраджэнцкая тэматыка, раман, пераклады з беларускай мовы на рускую.

Б) Пераклады з беларускай мовы на рускую, даследаванні беларускай паэзіі, паэма, услаўленне красы жыцця і мастацтва, культурна-гістарычная спадчына.

В) Мінск як месца нараджэння, даследаванні беларускай паэзіі, паэма, драма, услаўленне красы жыцця і мастацтва.

**Заданне 9.** Вызначце, хто з пералічаных беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца аўтарам прыведзенага верша. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (2 – за правільны адказ, 2 – за абгрунтаванне).*

Што ж вы, хлопцы, спахмурнелі?
Ці каго вы вы пахавалі?
Ці няшчасце вас здалела,
Што нуда апанавала?

Плюньце, хлопцы! Заспявайма,
Каб аж вокны задрыжалі!
Ва ўсе грудзі загукайма,
Каб злы думкі паўцякалі.

За работу жыва, жыва!
Каб нас доля не ўшчувала,
Каб не сохла наша ніва,
Каб нуда нас больш не гнала!

А) Янка Купала
Б) Цётка
В) Якуб Колас
Г) Максім Багдановіч

**Абгрунтаванне:**

______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________

**Заданне 10.** Ніжэй прыводзіцца арыгінальны тэкст класічнай рускай літаратуры і яго пераклад на беларускую мову. У асобных радках перакладу зробленыя пропускі. Пастарайцеся ўзнавіць версію перакладчыка і/або прапанаваць уласную. Пры стварэнні ўласнага варыянта (варыянтаў), дазваляецца поўнасцю змяняць радок, у якім ёсць пропуск, галоўнае – захаванне мастацкай цэласнасці.

*Максімальная колькасць балаў – 8 (па 2 балы за кожны адпаведны варыянт).*

| | |
|---|---|
| Люблю цябе, Пятра тварэнне, | Люблю тебя, Петра творенье, |
| Люблю твой строгі, стройны від, | Люблю твой строгий, стройный вид, |
| Нявы дзяржаўнае цячэнне, | Невы державное теченье, |

| | |
|---|---|
| Берагавы яе граніт, | Береговой ее гранит, |
| Узор тваіх чыгунных ____ | Твоих оград узор чугунный, |
| Начэй задумлівых тваіх | Твоих задумчивых ночей |
| Празрысты змрок, бліск цемнаваты, | Прозрачный сумрак, блеск безлунный, |
| Калі ў пакоі ____________ | Когда я в комнате моей |
| Пішу, чытаю без лампады | Пишу, читаю без лампады, |
| Гляджу на сонныя грамады | И ясны спящие громады |
| Пустынных вуліц, як бліпчыць, | Пустынных улиц, и светла |
| Адміралцейскі ў высях шпіц, | Адмиралтейская игла, |
| Як, не пускаючы начную | И, не пуская тьму ночную |
| Надоўга цьму на небе жыць, | На золотые небеса, |
| Адна зара спяшыць другую | Одна заря сменить другую |
| ____________ замяніць. | Спешит, дав ночи полчаса. |

*Пераклад Янкі Купалы (1937)* — *А.С. Пушкін. "Медны коннік".*

**Уласныя версіі**

*5 радок* ____________________________________________

____________________________________________

*8 радок* ____________________________________________

____________________________________________

*16 радок* ____________________________________________

____________________________________________